## *§ 8–0. Расійская імперыя ў XIX — пачатку XX ст.

САМАДЗЯРЖАЎЕ
РАЗНАЧЫНЦЫ
ДЗЕКАБРЫСТЫ ЗЕМСТВЫ
ДЗЯРЖАЎНАЯ ДУМА САСЛОЎЕ
ПРЫГОННАЕ ПРАВА РЭФОРМА
АБСАЛЮТНАЯ МАНАРХІЯ
НАРАДАВОЛЬЦЫ

Расійская імперыя напачатку XIX ст.

Успомніце, што такое саслоўная дзяржава.

**1. Рэформы дзяржаўнага кіравання.** Расійская імперыя да пачатку XIX ст. займала велізарную тэрыторыю, населеную шматлікімі народамі, якія адрозніваліся сваімі этнакультурнымі традыцыямі і ўзроўнем сацыяльна-эканамічнага развіцця. Расійская імперыя заставалася саслоўнай дзяржавай.

У першай палове XIX ст. у Расійскай імперыі праводзіліся рэформы дзяржаўнага кіравання, абумоўленыя крызісам састарэлай ваенна-бюракратычнай сістэмы кіравання, неадпаведнасцю работы ўсіх узроўняў дзяржаўных устаноў патрабаванням часу.

Праўленне Аляксандра I

Пераўтварэнні ў Расіі на працягу першай паловы XIX ст. былі непасрэдна звязаны з вырашэннем дзвюх праблем — сялянскага пытання і стварэння эфектыўнай сістэмы кіравання імперыяй. Ініцыятыва пераўтварэнняў зыходзіла ад самой улады. Вакол маладога імператара Аляксандра I (1801–1825 гг.) утварылася кола давераных асоб, якое называлася Негалосным камітэтам (у яго ўваходзіў і А. Чартарыйскі). Але перабольшваць радыкалізм рэфарматараў не варта. Канстытуцыйныя настроі,

якія ім прыпісваюцца, адрозніваліся ад еўрапейскіх уяўленняў.

| Еўрапейскае разуменне канстытуцыі | Расійскі канстытуцыяналізм пачатку XIX ст. |
|---|---|
| • увядзенне рэспубліканскай формы праўлення або істотнае абмежаванне выканаўчай улады; | • захаванне манархічнай формы праўлення; |
| • падпарадкаванне выканаўчай улады выбарнай заканадаўчай уладзе | • стварэнне сучаснай сістэмы ўлады і кіравання, пабудаванай на прыярытэце закону і свабодзе ад самадурства |

*Знайдзіце агульныя і адметныя рысы дзвюх мадэляў дзяржаўнага кіравання.*



*Аляксандр І. Мастак Д. Доу. 1825 г.*

Рэформы дзяржаўнага кіравання ў Расіі ў першай палове XIX ст. былі звязаныя з імем М. М. Сперанскага. Таленавіты чыноўнік па даручэнні імператара падрыхтаваў план дзяржаўных пераўтварэнняў «Увядзенне да Улажэння дзяржаўных законаў» (1809 г.).

Як вы лічыце, чаму кансерватыўныя расійскія чыноўнікі з пагардай называлі Негалосны камітэт «якабінскай бандай»?

| Рэформы, праведзеныя з ініцыятывы Негалоснага камітэта | Пераўтварэнні дзяржаўнага кіравання, прапанаваныя М. М. Сперанскім (рэалізаваныя часткова) |
|---|---|
| • пераўтварэнне вышэйшых і цэнтральных дзяржаўных устаноў:<br>– замена калегій на міністэрствы (1802 г.);<br>– узмацненне прынцыпу адзінаўладдзя;<br>– наданне міністрам шырокіх паўнамоцтваў і персанальнай адказнасці за дзейнасць сваіх устаноў;<br>• пашырэнне правоў вышэйшай дзяржаўнай установы — Сената (без надання заканадаўчых функцый) | • увядзенне падзелу ўлад на заканадаўчую, выканаўчую і судовую;<br>• стварэнне Дзяржаўнага савета і заканадаўчай Дзяржаўнай думы, а таксама незалежных судоў.<br>Рэалізавана на практыцы:<br>• 1810 г. — заснаваны Дзяржаўны савет (дзейнічаў да 1917 г.). У ім ствараўся наладжаны механізм падрыхтоўкі, прыняцця і адмены законаў, праходзілі зацвярджэнне ўсе праекты наступных рэформаў |



*Мікалай I.*
*Мастак Я. І. Ботман.*
*1859 г.*

Для каардынацыі дзейнасці міністэрстваў у 1802 г. быў створаны новы орган — Камітэт міністраў. Урадам у сучасным значэнні яго яшчэ нельга было назваць, гэта была нарада міністэрстваў пад старшынствам самога імператара.

Вынікам рэформаў Аляксандра I было стварэнне больш дасканалага бюракратычнага апарату і адладжанай вертыкалі выканаўчай улады.

Перыяд праўлення ў Расіі Мікалая I (1825–1855 гг.) характарызуецца ўзмацненнем самадзяржаўнага праўлення, пры гэтым насельніцтва было пастаўлена пад жорсткі кантроль бюракратычнага і паліцэйскага апарату. Праўленне новага імператара пачалося паўстаннем дзекабрыстаў (14 снежня 1825 г.), што паўплывала на ўнутраную палітыку ўлады. Урад ужо не мог цалкам давяраць дваранам і ў большай ступені пачаў абапірацца на паслухмянае чыноўніцтва.

У гады праўлення Мікалая I быў праведзены шэраг рэформаў у духу кансерватыўнай мадэрнізацыі.

| **Узмацненне рэжыму асабістай улады імператара** | **Удасканаленне заканадаўства** | **Умацаванне сістэмы палітычнай бяспекі** |
|---|---|---|
| Рост значэння Уласнай яго імператарскай вялікасці канцылярыі (УЯІВК) | Кадыфікацыя і сістэматызацыя дзеючых законаў — пад кіраўніцтвам М. М. Сперанскага былі падрыхтаваныя шматтомныя «Поўны збор законаў Расійскай імперыі» і «Звод законаў Расійскай імперыі» (усе новыя законы мусілі публікавацца як працяг «Зводу») | 1826 г. — стварэнне асаблівага органа палітычнай паліцыі — III аддзялення УЯІВК, якому падпарадкоўваўся корпус жандараў, што сачылі за добранадзейнасцю сваіх грамадзян і дзейнасцю іншаземцаў |

*Знайдзіце рысы кансерватызму і мадэрнізацыі ў рэформах Мікалая I.*

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

У 1839–1843 гг. пад кіраўніцтвам міністра фінансаў Я. Ф. Канкрына ў Расійскай імперыі была праведзена грашовая рэформа. Галоўнай грашовай адзінкай рабіўся сярэбраны рубель. Ён мусіў выкарыстоўвацца ва ўсіх здзелках, што заключаліся з казной і прыватнымі асобамі. Сярэбраны рубель быў забяспечаны залатой і сярэбранай манетай, медныя манеты ператварыліся ў разменны грашовы сродак.

*Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся:*
- *прычыны грашовай рэформы 1839–1843 гг.;*
- *якім чынам у ходзе гэтай рэформы адраджаўся давер насельніцтва да папяровых грашовых знакаў;*
- *наступствы грашовай рэформы.*

Новая сітуацыя склалася ў Расіі ў перыяд праўлення Аляксандра II (1855–1881 гг.). Улады адмовіліся ад абмежаванняў свабоды слова, жорсткай цэнзуры, было знята шмат забарон, напрыклад абмежаванне выезду за мяжу, праведзена амністыя дзекабрыстаў і рэвалюцыянераў-разначынцаў.

Але найважнейшай падзеяй была *адмена прыгоннага права* ў адпаведнасці з царскім маніфестам **19 лютага 1861 г.** Гэтая падзея паклала пачатак новаму перыяду ў гісторыі Расіі, запатрабавала рэфармаванне розных сфер жыцця грамадства.

Чарада грандыёзных пераўтварэнняў, што адбыліся пасля адмены прыгоннага права, атрымала назву Вялікіх рэформаў.

Вялікія рэформы — земская (1864 г.), судовая (1864 г.), школьная (1864 г.), гарадская (1870 г.) — істотна змянілі арганізацыю мясцовага кіравання і самакіравання ў Расіі, судовую сістэму і сістэму адукацыі. Стварэнне ўсесаслоўных органаў мясцовага самакіравання — губернскіх і павятовых земстваў — узняло на першае месца агульназемскія

### Праўленне Аляксандра II



*Аляксандр II.*
*Мастак М. А. Лаўроў. 1873 г.*

Успомніце, у чым палягалі Вялікія рэформы. Што значыў усесаслоўны характар органаў мясцовага самакіравання?

патрэбы, якія тычыліся ўсіх саслоўяў і катэгорый насельніцтва, у той жа час абмежавала інтарэсы пануючага дваранскага саслоўя. Аднак урад Аляксандра II ні ў якой меры не прадугледжваў змяненне палітычнага ладу.

### Праўленне Аляксандра III

Забойства рэвалюцыянерамі-нарадавольцамі Аляксандра II 1 сакавіка 1881 г. прывяло да змены курсу ва ўнутранай палітыцы. Пры новым імператару Аляксандру III (1881–1894 гг.) узмацніліся кансерватыўныя метады кіравання. Праведзеныя ў той час карэкціроўкі Вялікіх рэформаў, якія не зусім справядліва называюць контррэформамі, прывялі да ўзмацнення саслоўных прынцыпаў у кіраванні. Дваранства атрымала лікавую перавагу і ў земскіх, і ў гарадскіх органах самакіравання. Мясцовыя суды, паліцыя і органы самакіравання цяпер падпарадкоўваліся асобным земскім участковым начальнікам, якіх прызначаў міністр унутраных спраў выключна з ліку патомных дваран. Губернскія ўлады атрымалі права на любы тэрмін уводзіць надзвычайнае кіраванне, маглі высылаць непажаданых асоб, зачыняць навучальныя ўстановы.



*Аляксандр III. Фотаздымак 1880-х гг.*

Разам з тым у гады праўлення Аляксандра III заканадаўча была абмежаваная фабрычная праца малалетніх (было забаронена прымаць на работу дзяцей да 12 гадоў, а рабочы дзень дзяцей 12–15 гадоў быў скарочаны); забаронена начная праца жанчын і дзяцей да 17 гадоў. Пачаўся працэс адмены часоваабавязанага стану сялян, усе сяляне былі пераведзеныя на абавязковы выкуп зямлі. Сялянскі пазямельны банк даваў ім магчымасць атрымліваць пазыкі на куплю зямлі.

### Праўленне Мікалая II

У Расіі парэформеннага перыяду адбываліся значныя змены, усё больш настойліва гучала патрабаванне абмежаваць самадзяржаўе і стварыць прадстаўніцтва на ўзор заходнееўрапейскага парламента. Прыхільнікі канстытуцыйнага ладу знахо-

дзіліся і ў найбліжэйшым атачэнні імператара Мікалая II (1894–1917 гг.). Нарастанне супярэчнасцей у грамадстве прывяло да сур'ёзнага сацыяльнага выбуху — першай расійскай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі 1905–1907 гг. На піку грамадска-палітычнага крызісу **17 кастрычніка 1905 г.** імператар вымушаны быў выдаць Маніфест, які прадугледжваў стварэнне Дзяржаўнай думы, даражанне палітычных правоў і свабод.

**Маніфест 17 кастрычніка 1905 г.:**
- недатыкальнасць асобы;
- свабода слова, сумлення, сходаў і арганізацый;
- стварэнне прадстаўнічай установы — Дзяржаўнай думы, надзеленай заканадаўчымі паўнамоцтвамі.

Стварэнне першай у гісторыі Расіі заканадаўчай парламенцкай установы мела велізарнае значэнне для далейшага развіцця расійскай дзяржаўнасці. Упершыню насельніцтва атрымала права прадстаўляць свае інтарэсы на агульнадзяржаўным узроўні і ўплываць на лёс сваёй краіны. Нягледзячы на скасаванне Першай і Другой Дзяржаўных дум, наступная работа першага расійскага парламента давала каштоўны досвед дэмакратычнага кіравання.

Абсалютная манархія

**2. Эвалюцыя дзяржаўнага ладу.** На працягу ўсяго XIX ст. Расія заставалася абсалютнай манархіяй. Імператар меў паўнату ўлады — заканадаўчай, выканаўчай і судовай, узначальваў дзяржаўны апарат, асабіста прызначаў вышэйшых чыноўнікаў.

Ад другой чвэрці XIX ст. адметнай рысай унутранай палітыкі царскіх улад зрабілася ўмацаванне дзяржаўнай ідэалогіі. Менавіта тады была сфармуляваная вядомая трыяда міністра народнай асветы С. С. Уварава: «Праваслаўе, самадзяржаўе, народнасць».

Абвяшчэнне Маніфеста 17 кастрычніка 1905 г. і стварэнне вышэйшай прадстаўнічай установы — Дзяржаўнай думы — выступілі як падстава для змянення канстытуцыйнага ладу Расіі. Пачаўся пераходны перыяд ад абсалютнай манархіі да канстытуцыйнай, але ён не завяршыўся.

## ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

**С. С. Увараў. Аб некаторых агульных пачатках, якія могуць служыць дапаможнікам пры кіраванні Міністэрствам Народнай Асветы. 1833 г.**

Паглыбляючыся ў разгляданне прадмету і вышукваючы тыя пачаткі, якія складаюць уласнасць… адкрываецца выразна, што такіх пачаткаў, без якіх Расія не можа існаваць у дабрабыце, узмацняцца, жыць, — маем мы тры галоўныя: 1) Праваслаўная Вера, 2) Самадзяржаўе, 3) Народнасць.

Без любові да Веры продкаў народ, як і асобны чалавек, мае загінуць; аслабіць у іх Веру тое самае, што пазбавіць іх крыві і вырваць сэрца…

Самадзяржаўе ўяўляе галоўную ўмову палітычнага існавання Расіі ў цяперашнім яе выглядзе. Няхай летуценнікі падманваюць сябе саміх і бачаць у туманных выразах нейкі парадак рэчаў, адпаведны іх тэорыям, іх забабонам; можна іх упэўніць, што яны не ведаюць Расіі, не ведаюць яе становішча, яе патрэб, яе жаданняў. Можна сказаць ім, што ад гэтай смешнай прыхільнасці да Еўрапейскіх формаў мы шкодзім уласным установам нашым; што прага наваўвядзенняў разладжвае натуральныя зносіны ўсіх частак Дзяржавы паміж сабою і перашкаджае мірнаму, паступоваму развіццю яе сіл…

Разам з гэтымі двума нацыянальнымі пачаткамі знаходзіцца і трэці, не менш важны, не менш моцны: Народнасць. Каб Трон і Царква заставаліся ў сваёй магутнасці, належыць падтрымліваць і пачуццё Народнасці, якое іх злучае. <…> Што да Народнасці, уся цяжкасць палягае ва ўзгадненні старажытных і новых паняццяў; але Народнасць не заключаецца ў тым, каб ісці назад або спыняцца; яна не патрабуе нерухомасці ў ідэях. Дзяржаўны склад, як і чалавечае цела, перамяняе вонкавы выгляд цягам узросту: рысы змяняюцца з гадамі, але фізіяномія змяняцца не павінна.

1. *Як абгрунтоўвае С. С. Увараў свой выбар трох асноў дзяржаўнасці Расійскай імперыі?*
2. *Якія вобразы і параўнанні выкарыстоўвае аўтар дакумента для тлумачэння сваёй тэорыі?*
3. *Прыхільнікам якой ідэалогіі выступае С. С. Увараў? Прывядзіце цытату, што пацвярджае ваш адказ.*

**3. Сацыяльна-эканамічнае развіццё.** Развіццё эканомікі Расіі стрымліваў шэраг фактараў, найважнейшым з якіх было прыгоннае права, а пасля яго

адмены — захаванне перажыткаў (памешчыцкае землеўладанне, адпрацоўкі, сервітуты і г. д.). Буйна`я мануфактурная вытворчасць у Расіі мела сваю спецыфіку — у асноўным прадпрыемствы ствараліся самой дзяржавай для забеспячэння ўласных патрэб (напрыклад, для забеспячэння арміі і флоту). Іншая асаблівасць палягала ў саслоўнай прыналежнасці ўладальнікаў прадпрыемстваў — гэта былі памешчыкі-дваране і купцы. Пры гэтым на прадпрыемствах выкарыстоўвалася пераважна прымусовая праца прыгонных сялян.

Успомніце, што такое сервітут, адпрацоўкі.

Больш шырокія перспектывы для эканамічнай мадэрнізацыі Расіі адкрыліся пасля адмены прыгоннага права. Далейшы эканамічны рост забяспечвала прыватнае прадпрымальніцтва і свабодны наём рабочай сілы. Найбольш дынамічна развіваліся тэкстыльныя прадпрыемствы, на якіх выкарыстоўвалася наёмная праца і прадукцыя якіх збывалася на свабодным рынку.

Прамысловы пераварот пачаўся ў Расіі пазней, чым у іншых еўрапейскіх краінах, і зацягнуўся на больш працяглы перыяд — ад 1830-х да 1880-х гг. Аднак у канцы стагоддзя расійская эканоміка імкліва пераадольвала адставанне. У 1890-х гг. назіраўся нечуваны эканамічны ўздым: аб'ём прамысловай вытворчасці на 1900 г. вырас больш чым у 1,5 раза. Сусветны эканамічны крызіс 1899–1903 гг. закрануў і Расію, асабліва моцна ўдарыўшы па цяжкай прамысловасці. Але ў 1909 г. адбыўся новы прамысловы ўздым, які працягваўся да 1913 г. За зусім кароткі перыяд аб'ём прамысловай вытворчасці вырас з 4,3 да 6,5 млрд руб.

Вызначце прычыну больш позняга пачатку прамысловага перавароту ў Расіі.

У расійскай фінансава-эканамічнай сферы ў той час праяўляліся з'явы, характэрныя для імперыялістычнай стадыі развіцця капіталізму: утвараліся манаполіі розных тыпаў, развівалася банкаўская галіна, адбывалася зрашчэнне фінансавага

і прамысловага капіталу, прыцягваўся замежны капітал, пашыраліся рынкі збыту прадукцыі.

Актыўная роля ў эканоміцы дарэвалюцыйнай Расіі належала дзяржаве. Менавіта яна ініцыявала будаўніцтва чыгунак і ў далейшым захоўвала іх у сваёй уласнасці. Дзяржаве належала мноства прамысловых прадпрыемстваў, перш за ўсё ваеннай галіны, а таксама зямельныя ўгоддзі і прыродныя рэсурсы.

Правядзенне ўрадавых рэформаў напачатку XX ст. было звязана з імем міністра фінансаў і старшыні Савета міністраў С. Ю. Вітэ. Наступны старшыня П. А. Сталыпін паспрабаваў вырашыць праблему сялянскага малазямелля і разбурыць абшчыну, знізіўшы такім чынам сацыяльную напружанасць у цэнтры краіны.

Першая палова XIX ст.

**4. Грамадскія рухі.** У першай палове XIX ст. у Расіі пад уплывам ідэй Асветніцтва, Вялікай французскай рэвалюцыі, перамогі ў Айчыннай вайне 1812 г. і замежных паходаў рускай арміі паўстаў рух дзекабрыстаў, якія паспрабавалі ў 1825 г. змяніць дзяржаўны лад шляхам ваеннага перавароту, але пацярпелі паражэнне.

Наступны этап руху, рэвалюцыйна-дэмакратычнага паводле свайго характару, прынята называць разначынскім: ён быў звязаны з дзейнасцю, як правіла, разначыннай інтэлігенцыі — прыхільнікаў радыкальных пераўтварэнняў грамадства. У гэты час то ўзмацняўся, то ішоў на спад стыхійны сялянскі рух.

Рэвалюцыйнаму руху супрацьстаяў дзяржаўны кансерватызм, адметныя прадстаўнікі якога — Ф. В. Булгарын, К. П. Пабеданосцаў, У. П. Мяшчэрскі — выступалі ў падтрымку самадзяржаўнай формы праўлення, праваслаўнай веры і традыцыйных народных каштоўнасцей. У 30–40-я гг. XIX ст. у расійскім грамадстве афарміліся два

процілеглыя кірункі — славянафільства і заходніцтва.

| Славянафілы | Заходнікі |
|---|---|
| Адстойвалі ідэю самабытнага шляху гістарычнага развіцця Расіі, адрознага ад развіцця краін Захаду | Былі перакананыя ў тым, што Расія хоць і са спазненнем, але ідзе заходнім шляхам развіцця |
| Лічылі неабходным захаванне манархіі, магчыма, абмежаванай народным прадстаўніцтвам, выступалі за пераўтварэнні без узрушэнняў і недапушчальнасць рэвалюцыі. | |

**Другая палова XIX ст.**

На момант Вялікіх рэформаў найбольш трывалыя пазіцыі мелі прыхільнікі захавання існуючых парадкаў, стабільнага развіцця і асцярожных пераўтварэнняў «зверху». Разам з тым значны розгалас мела дзейнасць шэрагу нелегальных радыкальных гурткоў і арганізацый (найбольш вядомая — «Зямля і воля»), акцыі якіх — «хаджэнне ў народ», прапаганда сярод сялян, тэрор у дачыненні да вышэйшых дзяржаўных дзеячаў і нават імператара — мелі задачай стварыць у краіне рэвалюцыйную сітуацыю, разбурыць самадзяржаўнае праўленне і паспрыяць пабудове больш справядлівага грамадства. Аднак значных поспехаў рэвалюцыянеры-народнікі дасягнуць не здолелі, больш за тое, іх метады выклікалі неразуменне і асуджэнне.



Што адбылося ў Санкт-Пецярбурзе 1 сакавіка 1881 г. і якая сувязь гэтай падзеі з храмам Спас на

Напрыканцы XIX ст. у Расіі пачалі пашырацца ідэі марксізму. Па ўсёй краіне расла колькасць рабочых гурткоў на чале з таленавітымі прапагандыстамі, якія ў далейшым склалі аснову рэвалюцыйных партый.

**Пачатак XX ст.**

Напачатку XX ст. пад уплывам войнаў, рэвалюцый, пашырэння дзейнасці земстваў і працы Дзяржаўнай думы, распаўсюджвання навуковых ведаў у Расіі было створана мноства добраахвотных



*М. І. Пірагоў з сёстрамі Крыжаўзвіжанскай абшчыны*

таварыстваў, што мелі, як правіла, прафесійны характар. Да ліку найбольш вядомых прафесійных грамадскіх арганізацый належалі Пірагоўскае таварыства рускіх урачоў, Маскоўскае таварыства архітэктараў, Маскоўскае таварыства мастакоў, Рускае таварыства фатографаў і інш. Грамадская актыўнасць жанчын у Расіі праявілася ў такой спецыфічнай форме, як дзейнасць абшчын сясцёр міласэрнасці, якія ад 1863 г. уваходзілі ў структуру Міжнароднага Таварыства Чырвонага Крыжа.

**5. Руская праваслаўная царква і яе ўплыў.** Адзін з кірункаў у хрысціянстве — праваслаўе — з'яўляўся асноўнай канфесіяй у Расійскай імперыі. Напрыканцы XIX ст. праваслаўе вызнавала 69,4 % насельніцтва.

**Падтрымка дзяржавы**



*Будынак царкоўна-прыходскай школы пры Васкрасенскай царкве г. Царыцына. Канец XIX ст.*

На чале Рускай праваслаўнай царквы яшчэ ад 1721 г. стаяў Свяцейшы кіруючы сінод. Яго кіраўніком быў обер-пракурор — цывільны чыноўнік, якога прызначаў імператар, г. зн. царква апынулася цалкам падпарадкаваная дзяржаве.

Але дзяржава аказвала безумоўную падтрымку царкве. У той час як дазвалялася вольна пераходзіць з адной неправаслаўнай веры ў іншую, пераходзіць з праваслаўя ў іншую канфесію катэгарычна забаранялася. Толькі ў красавіку 1905 г. быў прыняты ўказ «Аб умацаванні пачаткаў верацярпімасці», паводле якога адмову ад праваслаўя ўжо не праследавалі.

**Роля ў адукацыі**

На працягу ўсяго перыяду XIX — пачатку XX ст. назіраўся няўхільны рост паствы Рускай праваслаўнай царквы, колькасці духавенства і храмаў. Пад уплывам царквы знаходзілася і частка галіны народнай асветы. Менавіта царкоўна-прыходскія школы і вучылішчы давалі пачатковую адукацыю насельніцтву ўсёй Расіі. Хоць у 1870-х гг. царкоўна-прыходскія школы былі падпарадкаваныя Міністэрству народнай асветы і перайшлі ў вядзенне земстваў, паводле ўказа імператара 1884 г. яны былі цалкам адноўленыя і пасля перападпарадкаваныя

адмыслова створанаму Вучылішчнаму савету пры Сінодзе. Фінансаванне царкоўна-прыходскіх школ узяла на сябе дзяржава.

Нягледзячы на пэўнае пашырэнне ў расійскім грамадстве ў XIX ст. атэістычнага светапогляду, поспехі навукі і ў цэлым тэндэнцыі секулярызацыі (аддзялення ад царквы) культуры, выбітныя царкоўныя іерархі захоўвалі свой маральны аўтарытэт. Напрыклад, духоўнае служэнне старцаў Опцінай пустыні спрыяла адраджэнню высокіх рэлігійных пачуццяў і шчырай веры. Дзякуючы падтрымцы дзяржавы праваслаўная царква пашырала свой уплыў не толькі сярод насельніцтва Расійскай імперыі, але і за яе межамі. Так, у канцы XIX — пачатку XX ст. вялася актыўная місіянерская дзейнасць у шэрагу азіяцкіх краін, у тым ліку ў Японіі, Карэі і Кітаі.

У якім горадзе знаходзіцца манастыр Опціна пустынь? Што вы ведаеце пра гістарычнае мінулае гэтага горада?

## ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

Цяпер у Кітаі налічваецца каля 15 000 праваслаўных вернікаў. Большаю часткай яны жывуць у Пекіне, Шанхаі, правінцыі Хэйлунцзян, аўтаномных раёнах Сіньцзян і Унутраная Манголія.

1. *Знайдзіце на карце гарады і правінцыі Кітайскай Народнай Рэспублікі, дзе жывуць праваслаўныя вернікі.*
2. *З якімі гістарычнымі падзеямі звязанае з'яўленне першых праваслаўных вернікаў у Кітаі?*



*Храм Пакрова Найсвяцейшай Багародзіцы. Г. Харбін (КНР)*

*XIX стагоддзе стала для Расійскай імперыі часам рэфармавання дзяржаўнага кіравання. У грамадстве афармляліся грамадскія арганізацыі і першыя палітычныя партыі, якія адстойвалі інтарэсы розных сацыяльных груп. Напачатку XX ст. пад уплывам падзей першай расійскай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі была створана Дзяржаўная дума, надзеленая заканадаўчымі паўнамоцтвамі.*

**калі ў свеце...**

1903 г. — II з’езд РСДРП. Адбываецца падзел партыі на бальшавікоў і меншавікоў

**на тэрыторыі Беларусі...**

1903 г. — створана Беларуская сацыялістычная грамада (першая беларуская нацыянальная палітычная партыя)

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Для характарыстыкі расійскіх імператараў у дарэвалюцыйнай гістарыяграфіі часта выкарыстоўвалі эпітэты: Аляксандр I — Дабраславёны, Аляксандр II — Вызваліцель, Аляксандр III — Міратворац. Растлумачце, як звязаныя гэтыя эпітэты з палітыкай дзяржавы ў перыяд іх праўлення.
2. Вызначце асноўныя тэндэнцыі ў рэфармаванні дзяржаўнага кіравання Расійскай імперыі ў XIX — пачатку XX ст.
3. Якія фактары стрымлівалі сацыяльна-эканамічнае развіццё Расійскай імперыі ў XIX — пачатку XX ст.? Чаму найбольш дынамічна развіваліся тэкстыльныя прадпрыемствы?
4. Складзіце тэзісны план «Грамадскія рухі ў Расійскай імперыі ў XIX — пачатку XX ст.».
5. Якую ролю ў жыцці расійскага грамадства адыгрывала Руская праваслаўная царква?